Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Нявыкарыстаныя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 48 — Вільня, Субота 17-га верасьня 1927 г. — Год I

Памажэце братом!

Грамадзяне! На землях братняга нам Украінскага Народу — у Галічыне — сталася вялізарная стыхійная катастрофа. Разводзьдзе зруйнавала больш за 800 сельскіх грамад, разбурыла тысячы сялянскіх хат, пакінула бяз даху над галавой і бяз куска хлеба соткі тысяч украінскіх сялян—напярэдадні зімы. Страты лічацца дзесяткамі мільёнаў польскіх злотых. Дзесяткі людзей утрацілі ў катастрофе свае жыцьцё.

Павадыры ўкраінскіх сялянска-работніцкіх арганізацыяў зьвярнуліся да сялян і работнікаў Заходняе Украіны з адозвай, у якой сьцьвярджаюць, што нельга ждаць ратунку ад панскае ласкі і панскіх крэдытаў пацярпеўшым, нельга спадзявацца на дапамогу буржуазных партыяў. Аўтары адозвы заклікаюць сялян і работнікаў, каб самі бралі ў свае мазалістыя рукі акцыю дапамогі, умацоўваючы адначасна ў масах сьвядомасьць сваей клясовай сілы і клясовай барацьбы.

У гэту цяжкую для нашых братоў-украінцаў часіну і беларускія сяляне й работнікі, хаця самі знаходзяцца ў мала лепшым матэрыяльным палажэньні, павінны прыйсьці з пасільнай дапамогай пацярпеўшаму ад катастрофы насяленьню Заходняе Украіны. Ня толькі колькасьць сабраных грошы (бо мы й самі — бедныя на грошы), але і самае выяўленьне спогаду нашым братом меціме тут цану. Дык — хто колькі дуж — складайце свае ахвяры і шліце па адрасу:

Зямельны Банк Гіпотэчны у Львове, вул. Підвале № 7 — Lwów,

адзначаючы на паштовых пераказах, што грошы пасылаюцца для Галоўнага Работніцка-Сялянскага Камітэту помачы ахвярам паводкі.

Водгукі паустаньня у Літве.

Спроба паўстаньня ў Крэтынзе?

Як падаюць газэты, была зроблена спроба паўстаньня такжа ў мястэчку Крэтынга. Падробнасьцяў няма. Ведама адно толькі тое, што там забіты—уноч з нядзелі на панядзелак—начальнік павету Грызас. Быццам ён хацеў затрымаць нейкіх трох западозраных у рэвалюцыянізьме людзей, якія на загад затрымацца і падняць рукі ўверх адказалі стрэламі з рэвальвэраў, ад каторых і пагіб Грызас.

Фашыстаўскі тэрор шалее.

Перадчасна дый няўдала выбухшае паўстаньне, пасьля яго падаўленьня, выклікала, зразумела-ж, страшэнны тэрор помсты з боку захапіўшых уладу валадыроў. Урад спаралiжаваў пошту, тэлеграф і тэлефоны, каб праз іх ня можна было даведацца аб тым, што фактычна робіцца ў краі. Камунікаты ўраду, ведама ж, адна хлусьня. Але і тое, што даходзіць з Літвы, кажа аб страшэнным разьмеры ўрадавага тэрору.

Зьмест і мэты паўстаньня раскрыліся ўжо ясна, ня гледзячы на фальшаваньне ў камунікатах. — Паўстаньне было не камуністычным, але якраз з боку ўсіх больш мерных кругоў народу і грамадзянства. Павадырамі былі сацыялісты і людоўцы, якія хацелі супраціўіцца фальшаваньню фашыстамі „народнай волі“—пры стварэньні новай „манархізаванай“ канстытуцыі Літвы, якая аддала б —ужо „законна“—усю ўладу бандзе, захапіўшай яе гвалтам—за ангельскія грошы...

Цікаўна, што ўрадавыя газэты ў Коўне вінавацяць у падрыхтоўцы паўстаньня — Польшчу!

31 расстрэл.

Фашыстаўскі ўрад, як відаць, пастанавіў стэрарызаваць яшчэ болей насяленьне Літвы—шляхам крывавае расправы з удзельнікамі паўстаньня ў Таўрогах.

Як падаюць газэты, дагэтуль у Таўрогах пакараны сьмерцяй шэсьць узятых у палон павадыроў паўстаньня.

Адбываецца яшчэ адзінаццаць такіх-жа працэсаў, а 20 палонных паўстанцаў чакаюць сваей чаргі. Усім няўхільна пагражае расстрэл.

Гэтак у найбліжэйшых днях лічба крывавых ахвяр фашыстаўскага тэрору дойдзе да 31.

Судзіць усіх ваенна-палявы суд.

Капітан Маюс.

Паўстанскі камандант Таўрогаў капітан Маюс, паводле газэтных вестак, уцёк у Нямеччыну.

Уцякаюць ад рэпрэсіяў.

Цэлы рад выдатных левых дзеячоў пакінуў Літву, каб ухіліцца ад арышту і перасьледваньня. Усе яны перайшлі граніцу або ў кірунку Латвіі, або Нямеччыны.

Два паслы, якія з пагранічнае Оліты перайшлі ў Польшчу, тлумачаць свой выбар тым, што тут было найбліжэй, а другое—што, літоўскі ўрад, знаходзячыся ў „стане вайны“ з Польшчай, ня здолее патрэбаваць у Польшчы іх выдачы. Усё ж паступак паслоў, перайшоўшых у яўна варожую да Літвы Польшчу, выклікаў вялікае нездаваленьне навет сярод ворагаў фашыстаўскага ўраду.

Жывы труп.

Ад „маёвага перавароту“ пачаўся востры крызіс польскага парлямантарызму. З кожным днём расла сіла выканаўчае ўлады—ўраду, а аднначасна зьмяншаліся ўплывы і значэньне Сойму і Сэнату. Дайшло да таго, што ўрад проста спыніў працу апошняе сэсіі законадаўчых установаў, калі тыя ўзыйшлі на шлях, непажаданы для ўраду. А скліканьне прэзыдэнтам Рэспублікі надзвычайнае сэсіі на дамаганьне прадугледжанае Канстытуцыяй лічбы паслоў адбылося ў такіх варунках, што маршалкі абедзьвюх палат лічылі неабходным запратэставаць проці нарушэньня вымогаў канстытуцыі—перад самім галавой Рэспублікі.

Той факт, што асабліва востры канфлікт між Соймам і ўрадам узьняўся на груньце соймавага законапраекту аб праве Сойму на самаразьвязаньне, паказуе лішні раз, у які тупік зайшоў Сойм, дзякуючы ўсім сваім старым кампрамісам і ўступкам, зробленым выканаўчай уладзе. Цяпер Сойм ня можа выйсьці з гэтага тупіка навет шляхам самагубства — шляхам самаразьвязаньня на падставе сваей уласнай пастановы. І, каб ня йграць далей недастойнае ролі пакорнага слугі выканаўчае ўлады, паном паслом астаецца толькі адно: *кожнаму паасобку зрачыся сваіх мандатаў* і гэтак нарэшце пахаваць той жывы труп, які ўсё яшчэ бадзяецца па сьвеце.

Ці Сойм пойдзе на гэты крок, ці будзе чакаць, каб яго ізноў распускалі—да скончэньня пяцілецьця пасольскіх мандатаў, трудна сказаць. Дый такі ці іншы канец сучаснага складу Сойму ўсё роўна не ўратуе яго ў вачох народных масаў: і ўвесь ён у цэлым, і галоўныя партыі яго даўно ўжо ўтрацілі веру ў народзе. Палітыка-ж ураду „санатараў“ зрабіла тое, што тая барацьба паміж сацыяльнымі клясамі Польшчы, якая адбывалася на парляманцкай арэне, з Сойму перайшла ў народныя гушчы.

Тое, што сталася з польскімі партыямі, якія ці то яўна служаць пануючай у Польшчы буржуазіі, ці йдуць на болей або меней яўнае згодніцтва з ею,—сталася і з астачай беларускага соймавага прадстаўніцтва. Як ведама, беларускія паслы з сялянска-работніцкай ідэалёгіяй апынуліся за вастрожнымі кратамі, і ўрад марш. Пілсудскага прызнаў магчымым дапусьціць дзеяльнасьць у Сойме і па-за Соймам толькі сельсаюзьнікаў і іхніх калегаў яшчэ больш правага кірунку. І гэтыя згодніцкія партыі зусім апраўдалі ўскладаныя на іх урадам надзеі: яны вядуць самую агідную, не перабіраючую ў найбруднейшых способах, барацьбу з вызвольным рухам працоўных беларусаў, не пакідаючы ў супакоі навет чыста культурных установаў, паскольку тыя не згаджаюцца праводзіць у масы ідэалёгію згодніцтва з буржуазіяй. Гэтак Беларускі Пасольскі Клюб у сучасным сваім складзе, праўда, заслужыў прыхільнасьць ураду, але ўтраціў усялякую веру ў масах—тых масах, якія ў 1922 годзе падавалі свае галасы і за тых паслоў, што сяньня сідзяць у Вронках, і за тых, што ўзыйшлі на шлях здрады інтарэсаў беларускага сялянства і работнікаў.

Гэта толькі павінна ўзмоцніць дамаганьне беларускіх працоўных масаў, каб сучасны Сойм, дзе няма нашых запраўдных абаронцаў, быў чым хутчэй распушчаны. Хай нарэшце закапаюць у зямлю гэты жывы труп. Хай скончыцца аднначасна і спэкуляваньне мандатамі на шкоду міліёнаў выбаршчыкаў-беларусаў, чым гэтак недастойна займаюцца хадэцка-сельсаюзьніцкія паслы. І хай народу нашаму будзе дадзена магчымасьць выбраць у новы Сойм тых людзей, якія не пакінулі сьцягу працоўных ні ад страху перад рэпрэсіямі, ні дзеля палітычных ці матэрыяльных карысьцяў для сябе.

Для вясковае моладзі.

Здаецца, ніхто ня будзе спрачацца аб тым, што ўся будучыня нашага адраджэнска-вызвольнага руху залежыць ад таго, як мы здолеем узгадаваць нашу моладзь. Дык і гаварыць аб неабходнасьці зьвярнуць асаблівую ўвагу на культурнае і ідэйнае ўзгадаваньне беларускае моладзі — няма патрэбы: яно — ясна і відавочна для кожнага. Аднак, што-ж у нас робіцца ў гэтай справе першараднае вагі?

Трэба прызнацца, што — ня шмат...

Праўда, некалькі сот хлапцоў і дзяўчат вучацца у бел. гімназіях, якія даюць ім і культурнае і ідэйнае ўзгадаваньне. Але ж гэта—кропля ў моры: сотні тысяч хлапцоўскае і дзявоцкае моладзі растуць, як кажуць, „на лес глядзя“. Лічба беларускіх публічных бібліятэк-чытальняў дужа невялікая; народных дамоў — яшчэ менш. І вось там, дзе няма шака ні таго, ні другога, моладзь „па традыцыі“ займаецца ў вольныя часіны адно толькі п'янствам, гульнёй у карты, скокамі ды распустай, што ў канцы канцоў даводзе да боек і разьбіваньня сабе ўзаемна галоў.

Вось аб гэтак занядбанай нашай моладзі нам і трэба падумаць. Дагэтуль гуртавала яе толькі адна ўстанова: вясковыя гурткі Таварыства Беларускае Школы. Там, у гуртках, моладзь магла і кніжку пачытаць, і газэту, і якую лекцыю паслухаць, а ладжаныя пры гуртках тэатры і хоры адцягівалі моладзь ад усіх тых благіх навукаў і заняткаў, аб якіх мы толькі-што сказалі.

Дык-жа вось гэтай працы пачала ўстаўляць палкі ў колы-польская адміністрацыя. Толькі-што шэф бясьпечнасьці Віленскага ваяводзтва паслаў Галоўнай Управе Таварыства Беларускае Школы афіцыяльнае трэбаваньне, каб з гурткоў Таварыства былі вылучаны ўсе сябры іх ад 18 да 21 году, бо быццам то права быць сябрамі Таварыства маюць толькі асобы, якія скончылі 21 год, а ў гурткі прымаліся і ад 18 гадоў.

Ня будзем тут спрачацца з „начальствам“, ці дамаганьне яго—законнае і справядлівае. Чыя сіла, таго й воля, — хоць у польскіх арганізацыях падобнага тыпу прымаюць сяброў ад 18 гадоў, і „начальства“ не пратэстуе... Будзем спадзявацца, што Таварыства Беларускае Школы пашукае спосабаў абароны інтарэсаў нашае вясковае моладзі, якая—выкіненая прыказам улады з гурткоў і адсуненая ад культурнае працы—няўхільна вернецца на старую дарогу дэмаралізацыі. Зьвернем тут увагу на патрэбу шырэйшае арганізацыі нашае вясковае моладзі наагул.

Неабходна прыступіць да арганізацыі таго-ж тыпу, які маюць—з дазволу ўладаў!—палякі ў пастаці „Саюзу Вясковае Моладзі“, дзе сябрамі зьяўляецца пераважна тая самая моладзь, для якой доступ у Таварыства Беларускае Школы зачыняюць віленскія ахоўцы публічнае бясьпечнасьці, пагражаючы інакш зачыненьнем Таварыства. Неабходна, каб па ўсіх беларускіх паветах патварыліся такія-ж саюзы вясковае моладзі, як існуюць ужо польскія,—навет з такімі-ж самымі статутамі. І толькі тады мы здолеем скутэчна змагацца з страшэнным пашырэньнем дэмаралізацыі сярод вясковае моладзі, што так часта сьцьвярджаюць і нашы карэспандэнты, і—мо' йшчэ часьцей—паліцэйскія пратаколы аб бойках і калецтвах, а то і забойствах у часе вечарынак і гулянак.

Самаўрадавыя дзеячы: для вас гэта — найбольш адпаведная задача. Займецеся гэтай справай, бо-ж пры дапамозе самаўрадаў можна вельмі многа зрабіць дзеля аховы нашае моладзі ад маральнае загубы. **К. Ф.**

Да нашых падпішчыкаў.

Пасылаючы рахункі, просім пав. грам. Падпішчыкаў урэгуляваць падпісную плату.

Хто да 1 кастрычніка не ўрэгулюе падпісной платы, або ня прышле паведамленьня, што грошы будуць прысланы, таму высылка газэты будзе спынена. **Адміністрацыя.**

З газэт.

Урадавы орган—аб „Грамадзе“.

„Кур. Віл.“, які неяк дужа зьменна піша аб беларускім руху, зьмясьціў у № 210 з чацьвярга 15-га верасьня стацьцю, у якой паміж іншым піша:

> Школьніцтва — гэта найбольш чулая струна, на якой—на міжнароднай арэне—нацыянальныя меншасьці выйгрываюць паважныя атуты проці дзяржаў, у межах каторых жывуць... Крывавыя польска-украінскія падзеі 1918 году, якія былі папярэджаны замахам Січынскага на былага намесьніка (намесьніка аўстрыяцкага імпэратара для Галіччыны—паляка) Патоцкага, а таксама іррэдэнцкая (незалежніцкая) дзеяльнасьць „Грамады“ — гэта вынікі неўласьцівае школьнае палітыкі, якую перад вайной у Малапольшчы (Галіччыне) вяло польскае грамадзянства, а ў апошнія часы вяла незалежная Польшча ў адносінах да украінскага і беларускага насяленьня.

Ня шкодзіла-б абароне нашых заарыштаваных паслоў далучыць да справы гэтыя словы ўрадавае часопісі...

Сойм і Сэнат.

Калі пачне працаваць Сойм?

Спозьнена—з яўным нарушэньнем Канстытуцыі — „скліканы“, але не „адчынены“ Сойм пачаў ад 13-га верасьня выяўляць знакі жыцьця.

Першым чынам абодва маршалкі—Сойму і Сэнату—п. п. Ратай і Тромчыньскі—паехалі да п. Прэзыдэнта, з якім канфэравалі аж 2 гадзіны. Відаць, умаўляючыся аб дню „адчыненьня“ Сойму. Ці і як пратэставалі яны тамака проці нарушэньня Канстытуцыі, прэса пакуль-што выразна ня кажа.

Пасьля гэтай візыты маршалкаў, увечары 13 га верасьня адбылося паседжаньне канвэнту старшыняў соймавых клюбаў, на якім пастаноўлена склікаць першае паседжаньне Сойму на 19 га верасьня. Як відаць, паслы таксама ня вельмі сьпяшацца ўзнаўляць працу Сойму.

Чым мае заняцца Сойм у гэтую надзвычайную (можа-ж і запраўды яна будзе „надзвычайнай“ — хто ведае?!) сэсію. Газэты пішуць, быццам на паседжаньні канвэнту думкі аб гэтым падзяліліся. Адны хацелі, каб сэсія пачалася якраз з самага баявога пытаньня, проці якога асабліва пратэстуе

ўрад: з праекту ППС аб самаразьвязаньні Сойму. Тады быццам урад, які ўсё-ж хоча, каб Сойм правёў некалькі важных для яго законаў, можа-б рашыўся адразу разагнаць Сойм, як пагражае яўна „бутэрбродная прэса“.

Больш асьцярожныя паслы, зразумела-ж: пераважна хіена-пястоўскай масьці, — трэбавалі, наадварот, каб гэтую асабліва „дражлівую“ справу адлажыць на канец, — каб мець запэўненую магчымасьць правесьці асабліва пільныя для Краю законы. А пасьля ўжо — „рызыкнуць“... Ясна, што ім ідзе перадусім аб зьмене выбарнага закону... I цікаўна, што значную большасьць здабыў іменна гэты другі, больш асьцярожны плян, які датаго ж адкладае, відаць, ня вельмі пільную для паноў паслоў справу самаразьвязаньня Сойму. Бо ж ёсьць яшчэ й надзеі на тое, што ўрад прадоўжыць жыцьцё гэтага Сойму—аж да вясны.

Урэшце, як паведамляюць газэты, пастаноўлена ўсё-ж паўтарыць 19-га верасьня цэлком тую самую павестку, якая была на парадку дня 15-га ліпня, калі праца Сойму была спынена ўрадам. Гэта значыць, што Сойм ня хоча востра правакаваць канфлікт з урадам, але і—не баіцца канфлікту.

Дык ня выключана, што другая надзвычайная сэсія Сойму ізноў скончыцца „надзвычайна“...

Сойм і Урад.

„Роботнік“ паведамляе, што ў соймавых колах ёсьць думка скасаваць шырокія паўнамоцтвы для ўраду, дадзеныя Соймам, ці прынамся—значна абмежыць іх.

„Склікана“ і сэсія Сэнату.

Прызыдэнт Рэспублікі склікаў сэсію Сэнату на 22-га верасьня. Першае паседжаньне, аднак, як і першае паседжаньне Сойму, гэтым ня вызначана на дзень „скліканьня сэсіі і будзе вызначана асобна.

Аб польскім праекце у Лізе Народау.

Пакрысе выясьняецца — у водгуках загранічнай ды краёвай прэсы — запраўдны зьмест і лёс „мірнага пачыну Польшчы“ ў Лізе Народаў.

Трэба добра разабрацца ў-ва ўсей гэтай справе, бо яна пэўна ж датычыць ня толькі Польшчы, але і—усей Эўропы.

Як ведама, дый як выразна толькі што сцьвярдзіў такі аўтарытэтны францускі публіцыст, як п. Пэртіна (з „Эко дэ Пары“), — „Польшча мае зусім не выстарчаючую ахову ў Лёкарнскім Трактаце, якія-б салодкія словы ні казаў проці гэтага сам Брыян“... — П. Пэртіна сцьвярджае, што Лёкарно не забараняе навет фармальна Нямеччыне хапіцца вайны на яе ўсходняй граніцы“... Ня кажам ужо аб тым, што Лёкарно зрабіла выразна розьніцу ў „сіле гарантыяў“ для граніцаў заходніх суседзяў Нямеччыны і—усходніх.— Дык вось усе вялікія дзяржавы, як адна, адмовіліся даць дадатковыя гарантыі гэтым усходнім нямецкім граніцам Нямеччыны—з Польшчай, пакінуўшы ўсё, як ёсьць—так, як гэта сцьвярджае п. Пэртіна.

Здаўшы гэтую першую пазіцыю, Польшча ў Лізе зрабіла, трэба думаць, спробу здабыць другую важную для сябе пазіцыю— „другой ліньі“... Замест таго, каб выразна і канкрэтна гарантаваць ад вайны з боку Нямеччыны свае граніцы, пакрыўджаныя ў Лёкарно, польскі дэлегат пачаў сваю атаку проці вайны наагул... Калі-б гэта яму ўдалося, Польшча, ратуючы гэтым сваю справу, зьявілася-б адначасна дабрадзеем усіх народаў— „тварцом вечнага міру“ ня толькі ў Заходняй Эўропе, але і на ўсім сьвеце, ахопленым Статутам Лігі Народаў... Але й гэта ей не ўдалося.

Справа ў тым, што Статут Лігі Народаў, які—у першых сваіх словах — ставіць мэтай усяго „Саюзу Народаў“ „запэўненьне міру“ — шляхам „абавязковага нетасаваньня вайны“, узапраўднасьці ясна і выразна допускае вайну — навет паміж сябрамі Лігі... § 7, арт. 15 кажа:—

„У разе, калі Рада ня здолее давясьці да згоднай аднамыснай пастановы (вырашаючай спор між дзьвюма дзяржавамі, — пры чым заінтарэсаваныя староны не галасуюць), тады сябры Лігі засьцерагаюць сабе права дзеяньня так, як знойдуць неабходным, бароначы правы і справядлівасьць“... Ясна, што „правы і справядлівасьць“ будуць у гэтых споручых старонаў—розныя, дык могуць быць „вырашаны“ толькі—вайной...

Мы ведаем, што Вэрсальскі Трактат дае магчымасьць перагляду тых з устаноўленых ім граніцаў, якія пагражаюць міру, дый сталіся—дзякуючы „зьмяніўшымся абставінам“— немагчымымі да ўтрыманьня... Можна лёгка зразумець, што такімі граніцамі могуць найлягчэй дый у першую чаргу аказацца граніцы ўздоўж „польскага калідору да Гданску“... I калі-б спор за гэтыя граніцы ў Радзе Лігі з часам сабраў усе галасы на карысьць Нямеччыны, — Польшча, як і Нямеччына, ня мелі б голасу ў уласнай справе. Тады маглі-б быць два выпадкі: або Польшча споўніла-бы пастанову Рады, і тады граніцы Нямеччыны з Польшчай былі-б папраўлены бяскроўна; або Польшча адмовілася бы падпарадкавацца пастанове Рады, і тады якраз і меў-бы сілу § 7 арт. 15-га Статуту Лігі, які дае права споручым старонам—тасаваць вайну..

Трэба думаць, што польскі дэлегат якраз і зрабіў спробу намовіць вялікія дзяржавы, каб яны згадзіліся—скасаваць, вычыркнуць з Статуту Лігі гэты запраўды-ж агідны й небясьпечны для слабейшых дзяржаваў параграф.

Наіўнасьць гэтай спробы, калі іменна яна мела тут месца, запраўды-ж кідаецца ў вочы. Ці-ж запраўды хто можа паверыць, каб якая вялікая дзяржава, ды яны ўсе разам,—згадзілася шляхам скасаваньня на паперы гэтага параграфу загарантаваць на дзеле фактычную роўнасьць усім малым, слабым дзяржавам—побач з сабой, зрокшыся гэтак свайго ўплыву, абапертага на аружнай сіле, у розных сучасных ды будучых спорах вялікіх дзяржаў з малымі?!. Ці-ж хто павера паважна, што можна нахіліць Англію, якая спрадвякоў жыла ды пашырала сваю ўладу міжнародавым разбоем ды гвалтам, каб яна выраклася тасаваньня ваеннага гвалту над іншымі слабейшымі дзяржавамі—толькі затым, што яны ўвайшлі ў склад Лігі, дый пачалі „лічыцца роўнымі“ з ёй!? Найлепшым прыкладам—кітайская авантура Англіі ды Японіі, якая зьяўляецца запраўдным скандалам ды канчальным маральным банкруцтвам Лігі Народаў!..

I вось, у гэтым пункце і трэба шукаць прычыны таго страшэннага, ледзь стрыманага пад забойча халоднай англійскай ветлівасьцю, гневу проці Польшчы Чэмбэрлена, які галоўным чынам і праваліў увесь „мірны пачын Польшчы“ ў Лізе Народаў... Трэба толькі прачытаць дакладны тэкст прамовы Чэмбэрлена на дыскусіі аб польскім праекце. Бо-ж справа ў тым, што, цэлячыся ў Нямеччыну, польская дыпляматыя папала запраўды ж цяжкім, забойчым ударам у свайго новага прыяцеля ды апякуна—Англію! Праўда, удар гэты папаў у Англію — за тое і тады, калі яна адмовілася ад першай прапазіцыі Польшчы—даць дадаткова гарантыю польскім заходнім граніцам. Але гэта тым больш узлавала Чэмбэрлена... Польскі праект скасаваць вайну зьявіўся быццам яўна-варожай правакацыяй проці вялікіх дзяржаваў, а перадусім проці Англіі, якая падыймала проці іх усе меншыя ды слабейшыя дзяржавы. Гэта была запраўдная „спроба бунту проці Англіі“ ў лоне Лігі Народаў!..

Так гэта зразумела і спрытная француская дыпляматыя, бышая, відаць, у бліжэйшым кантакце з польскай дэлегацыяй і выкарыстаўшая польскі праект—дзеля свайго ўмацаваньня ў апініі меншых дзяржаваў, коштам Англіі...

Трэба толькі пачытаць, як выкручываўся Чэмбэрлен, кампрамітуючыя ўсё глыбей у вачох меншых дзяржаваў, каб зразумець, што англійскі ўрад ніколі не забудзе кіраўніком польскай палітыкі гэтай „прыяцельскай услугі“...

У выніку ўсяго гэтага проці „польскага мірнага пачыну“ стварыўся магутны фронт Англіі—Нямеччыны—Італіі, да якіх, вельмі спрытна, забясьпечыўшы сябе ад нараканьня „меншых братоў“, далучылася і Францыя. Такім чынам і гэтая пазіцыя была здана польскай дэлегацыяй.

Цяпер яшчэ раз паглядзім канкрэтна, што-ж асталося ад усяго гэтага пачыну пана Сокаля ў Жэнэве?—Паслухаем, як ён сам — пасьля сказаных двух адступленьняў—азначыў свае новыя пазіцыі. Падаем найбольш выразныя месцы паводле тэксту, паданага Польскім Агенцтвам (—курсыў ўсюды наш).

„Пэдагагічнае значэньне заявы (ўсіх дзяржаваў) аб нетасаваньні мераў вайны палягае на вытварэньні атмасфэры, спрыючай“... і т. д.

Трэба верыць ў „вечны мір“, „ня трэба паддавацца пачуцьцю расчараваньня“... „Я прадбачу закід, што гэткага роду дэклярацыя не ўнясе нічога новага (дзіва, што не!... К.) у дасюляшні стан рэчаў, што яна зьяўляецца толькі паўтарэньнем дый навет аслабленьнем(!) таго, што ёсьць у Статуце Лігі“... „Наш намер—зьвярнуцца з заклікам да ўсіх народаў, каб яны... зракліся тасаваньня вайны“... „Але-ж мы зусім ня маем намеру прапанаваць што-небудзь такое, што зьмяніла б пастановы Статуту Лігі Народаў“...

„Вера ў немагчымасьць вайны і поўнае, рэальнае забясьпечаньне проці вайны — гэта ж зусім розныя рэчы“... Так казаў, бароначы сваю апашнюю пазіцыю ў Лізе, сам польскі дэлегат...

Ну, на гэткую „маніфэстацыю веры ў вечны мір“ ахвотна пайшлі ўсе вялікія дзяржавы... Сваё „рэлігійнае“ адношаньне да гэтай веры найлепш за ўсе вялікія дзяржавы выразіў Чэмбэрлен. — У сучасны мамэнт „вечны мір“ побач з яго геніем-ахоўцам — Лігай Народаў—ён прыраўнаваў да жалуда, які трэба цяпер старанна пасадзіць у зямлю, ды цярпліва чакаць, пакуль з яго ня вырасьце магутны дуб, пад якім — прыкладам, гэтак гадоў—праз 1000 — можна ўжо будзе ўсім вольным ды роўным народам добра пасесьці“...

А пакуль што—перапрашаем: гэты „вечны мір“ дый Лігу Народаў трэба трымаць усьцяж у стане жалудоў, каб — у разе патрэбы—іх магла-бы зьесьці, праходзячы міма, тая ці іншая вялікая... скажам, дзяржава, бо яны, як ведама усім, вельмі любяць гэтыя „жалуды міра“, дый найлепей ад іх—таўсьцеюць!...

Кандратовіч.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Ліга народаў і польскі мірны пачын.

Прамовы Штрэзэмана, Брыяна і Чэмбэрлена.

Нажаль, мы можам даць толькі вельмі кароткія кавалкі вельмі цікаўных прамоваў галоўных кіраўнікоў Лігі—Штрэзэмана Брыяна і Чэмбэрлена...

Як мы паведамілі ўжо, першым на „гістарычным“ паседжаньні Лігі казаў сваю прамову Штрэзэман — аб польскай прапазіцыі, хаця выпажыў гэтую прапазіцыю польскі дэлегат толькі пасьля прамовы нямецкага...

Штрэзэман аж заліваўся, выхваляючы ўстанову Лігі Народаў, якая дае адзіную дарогу дзеля захаваньня міру—бо дае ня толькі спосабы ўтрымаць ды ахоўваць тое, што ёсьць, але і — слухайце-ж... Мірныя спосабы вытварэньня ў будучыне ўжо зусім добрых і сталых адносінаў між народамі—шляхом зьмяненьня ці скасаваньня ўсяго таго, што іх цяпер дзеліць...

Далей Штрэзэман усё залаціў паверхню тэй польскай рэзалюцыі, з якой ён сам з Чэмбэрленам выняў яе ўнутраны зьмест...

„Некаторыя, быць можа, хацелі-б, каб мірны пачын Польшчы ўлажыць у ясны трактат, маючы выразную формулу ды абавязываючую сілу, але-ж вера і ідэя пэўна-ж могуць мець такую-ж сілу, як праўная формула“... Праўда... толькі вось — могуць і ня мець... Дый вось, напрыклад, Францыя не згадзілася на тое, каб яе граніцы былі „загарантаваны“ — сілай веры і ідэі...

Прамова Брыяна.

Брыян пачаў з палемікі проці італьянскага дэлегата Шалоі, які папросту зьдзекаваўся над „працай Лігі ў галіне разбраеньня“, а аб польскім праекце сказаў, што гэта ж толькі—„вельмі пабожнае пажаданьне“...

Далей Брыян залаціў таксама пігульку польскай дэлегацыі, выхваляючы „красамоўства ды сілу шляхотнага пачуцьця“ ў прамове п. Сокаля.

Але найбольш цікаўным і сэнсацыйным былі тыя гарачыя пахвалы, якія, Брыян ахвяраваў у сваей прамовы па адрасу... Штрэзэмана.

Асабліва ён выхваляў Штрэзэмана за яго, запраўды ж спрытную заяву аб тым, што „падпісываючы Лёкарнскія Трактаты, ён ня меў розных пагляда ў на вайну—на захадзе ці на усходзе“... А з гэтага вывад—ясны: ніякога „Усходняга Лёкарно“, ці дадатковых гарантыяў для польскіх граніцаў,—ня трэба... Вельмі небясьпечна для Польшчы выхваляў Брыян Штрэзэмана за тое, што той заявіў, што будзе ў вырашэньні спораў Нямеччыны з іншымі дзяржавамі (чытай: з Польшчай)ісьці не шляхом вайны, але шляхом праўным — праз Лігу Народаў... З зьмешчанай сёньня стацьці—ясна, якія небясьпекі пагражаюць Польшчы ад гэтага „праўнага шляху“, прадбачанага Статутам Лігі. „Праўда, пасьля п. Штрэзэмана, дадаў Брыян, могуць прыйсьці да ўлады ў Нямеччыне людзі, якія могуць мець іншыя пагляды на тыя маніфэстацыі веры ў мір, якія зроблены тут — па пачыну Польшчы—усімі намі... Але ж—урачыстыя прысягі міру, жывыя ў памяці народаў, ня так лёгкаважыць“... Дый як-жа можна цьвярдзіць, быццам урачыстае выражэньне маральнай волі нічога нявартa, ці ня ўносіць нічога новага... Пэўна ж уносіць новае... Калі—у пэўных абставінах — ня час яшчэ ды ня можна будаваць нешта рэальна, дык ці-ж ня пекна ёсьць прынамсь — выразіць надзею дый галасна заявіць свае жаданьне будаваньня“... „Гэткага роду дэклярацыі жаданьня будзяць... рэха ў сумленьні людзей, уваходзяць у сьведамасьць масаў“.,.

I так далей—усё у тым-жа літэратурнакасьцельным родзе мастацкага красамоўства, якое нажаль рубежыць з гумарыстыкай ці найзласьнейшай сатырай на самаго сябе. Але ў кожным разе нічога абсалютна ня мае супольнага — з палітыкай... Бо-ж палітыка і ёсьць якраз штука рэальнага будаваньня чагосьці рэальнага.

Прамова Чэмбэрлена

Чэмбэрлен казаў сваю прамову так, як, здаецца, яшчэ ніколі ніхто ў Лізе Народаў.— Ен аж кіпеў ды тросься ад злосьці. Уся яго прамова ахвяравана была — абароне англійскай палітыкі... Дый мала таго—абароне самага існаваньня Англіі, як адзінай вялікай дзяржавы... I ад нейкіх падазрэньняў, крытыкі ды жаданьняў ад Англіі—з боку сяброў Лігі Народаў...

Ужо адно гэта сьведчыць аб настроі англійскай дэлегацыі, выкліканым высунутым Польшчай праектам...

„Трэбаваньні, якія ставяцца тутака Англіі, крыюць у сябе выразнае імкненьне да... зьніштажэньня Брытанскай Імпэрыі“... Так літэральна распачаў сваю прамову Чэмбэрлен, ставячы—у адзін рад націск на Англію з боку яе марскіх калегаў Амэрыкі і Японіі— у справе разбраеньня на моры—і дамаганьні цяпер ад Англіі дадатковых гарантыяў для граніцаў Польшчы...

Далей—з дрэнна скрытай злосьцю — ён казаў аб тым, што пасьпех усякага пачыну залежыць ад таго, каб — не сьпяшыць, а ў кожным разе—ня высоўваць ніякіх праектаў —без папярэдняга добрага падрыхтаваньня. „Праца падгатаваўчая, гэта—канешны варунак пасьпеху. — Дык незаўсёды-ж пасьпех запэўняе вялікія рэзультаты, дый навет незаўсёды ўплывае на тое, каб іх прысьпяшыць“... Каму-ж ня ясна, што гэтае злосна-ядавітае месца прамовы цалком скіравана проці польскага ўраду, які высунуў свой праект, без папярэдняга паразуменьня, навет без папярэджаньня Англіі. Далей — у тым самым злосна-палямічным тоне — Чэмбэрлен бароніць палітыку Англіі, якая, сьцьвердзіць ён, ёсьць больш мірная дый разбраенёвая, чым палітыка ўсіх іншых дзяржаваў, якія цяпер судзяць ды пальмуюць Англію...

I ўжо яўна ізноў проці Польшчы скіравана ўказаньне Чэмбэрлена на тое, што — паміж іншымі крокамі мірна гаранцыйнай палітыкай Англіі—яна гарантавала дадаткова проці ўсялякіх замахаў на граніцы Францыі і Бэльгіі... (кожны слухач павінен быў дадаць сам: але ня Польшчы...). I далей. — „А калі цяпер вы, паны, (польская дэлегацыя...) жадаеце ад нас, каб мы зрабілі больш (чытай: гарантавалі і польскія граніцы...), дык мы спытаем вас: хто-ж з вас, паночкі, перад тым, каб як націскаць на Англію, зрабіў бы больш, як мы“... I далей — яшчэ больш забойча для шмат каго з прысутных... — „Вы трэбуеце, каб Англія гарантавала, апрача заходніх граніцаў, яшчэ і іншыя (чытай: польскія). Дык я-ж пытаюся вас, паночкі, — ці, апрача гэтых апошніх граніцаў, няма больш на сьвеце ніякіх іншых загрожаных граніцаў, якія можа-б вы, даражэнькія паны, узялі пад сваю высокую апеку — таксама, як мы ўзялі пад сваю—граніцы Францыі і Бэльгіі“.

Але-ж далей — яшчэ „прыязьней“ для Польшчы.

„Вы гаворыце, паночкі, што мы робім мала, дый запрашаеце нас, каб Англія аддала сваі гарантыі кожнай дзяржаве і ўсім граніцам на сьвеце, „гарантыі тэй самай сілы, якія мы ўдзялялі ўжо ў адным Трактаце (Лёкарнскім). Дык на гэта трэба адказаць каротка: гэта — Нямеччына“. Далей Чэмбэрлен з цікаўнай адкравеннасьцю заяўляе, што ёсьць на сьвеце яшчэ адна Ліга, якая для яго дый для ўсіх англійцаў—даражэй ды бліжэй, як гэтая Ліга Народаў: гэта Ліга дзяржаваў, уваходзячых у склад Брытанскай Імпэрыі... Англія ніколі ня згодзіцца, каб з Лігі Народаў зрабілася нейкая „Над—Дзяржава“,—з рашучай сілай сваіх канчальных загадаў... Не, Ліга павінна быць і стацца—маральна-праўным Трыбуналам народаў. Ліга павінна быць толькі пасрэднікам між дзяржавамі, які толькі зьмягчае рызыку вайны між імі. Але-ж, дадамо ад сябе выразьней: — ня спыняе назаўсёды вайну, якая патрэбна... вялікім, сільнейшым дзяржавам.

I тут, у канцы прамовы красамоўны дэлегат шляхотна — пацыфічна-пірацкай дзяржавы зрабіў сваё знамянітае параўнаньне Лігі Народаў, як ахоўцы міру — з жалудом, з якога калісьці вырасьце — вялікі дуб міру, пад аховай якога схароняцца ўсе народы — брыты... Толькі вось ня трэба прысьпяшаць узросту гэтага дуба — з жалуда...

Мірныя прапазіцыі Польшчы і Галяндыі— ў камісіі.

Пасьля дыскусіі на Агульным Зборы Лігі, дзе ўсе аратары вялікіх дзяржаваў пекна малявалі ды залацілі той гроб, у які яны пахавалі зьмест і душу гэтых прапазіцыяў, апошнія былі перададзены ў камісіі ў справе разбраеньня.

У гэтай камісіі ўжо пачалася далейшая дыскусія над усімі гэтымі рэзалюцыямі, з якіх трэба зрабіць адну—супольную, кампрамісную, якую камісія і запрапануе Агульнаму Збору для зацьверджэньня.

Можна згары ўжо сказаць, што канчальная рэзалюцыя будзе больш, амаль ня зусім блізкая да польскага праекту, а не галяндзкага,—бо польская дэлегацыя залішне лёгка сама зрабіла ўсе тыя ўступкі ды папраўкі, якіх трэбавалі вялікія дзяржавы, а галяндзкі дэлегат цьверда і выразна стаў на сваім, не згаджаючыся сам сваімі рукамі выняць душу з свайго праекту...

Голас францускай прэсы.

Ведамы п. Заўэрвэйн з газ. „Матэн“ піша, што польская рэзалюцыя — значна горшая, як галяндзкая. Польская рэзалюцыя — сантымэнтальная ды плятонічная (сантымэнт значыць пачуцьце; плятанічны значыць—ідэальны, далёкі ад рэальная зямлі і запраўднасьці).

Голас чэшскай прэсы.

Пражскія „Народныя Навіны“ пішуць:

„Нявыразнае міжнародавае палажэньне найбольш пагражае бясьпечнасьці Польшчы, для якой палавічнасьць мірных гарантыяў ёсьць горшая, як іх поўная адсутнасьць. — Бо-ж—дзякуючы Лёкарнскаму Трактату—граніцам Польшчы пагражае большая небясьпека, чым гэта было дагэтуль“.

Бяспрыкладная крывавая расправа.

Войскі Чанг-Тсо-Ліна выразалі 80.000 мірных грамадзян.

Паводле інфармацыяў кітайскіх газэт у Пэкіне, адзін з генералаў Чанг-Тсо Ліна, Фэнг Ю Гсіянг, учыніў „крывавую лазьню“ ў месьце Чанг-Тэ — за тое, што там—у часе рабаваньня салдатамі мірнага насяленьня — былі забіты некалькі салдатаў. Войску быў дадзены загад: рэзаць усіх без міласэрдзя! I вось пачалося нешта, не падобнае да веры: салдаты забівалі мірных безбаронных людзей— бяз розьніцы пола й веку, — мужчын, жанок, дзяцей.

Як апавядаюць уцекачы, якім удалося вырвацца з рук ашалелых катаў, выразана некалькі дзесяткоў тысяч людзей — ад 30 да 80 тысяч.

Трэба адзначыць, што такой жорсткасьці ня здарылася дагэтуль на ўсім працягу існаваньня чалавецтва.

Маральная адказнасьць за гэты ўчынак ляжыць на тых „цывілізаваных“ белых дзікунох, якія фінансуюць контрэвалюцыйны рух у Кітаі. Ганьба ім!

Нямецкі голас.

Ведамы Т. Вольф з „Фоссішэ Цэйтунг“ піша:

„Банальная польская рэзалюцыя мае тое адзінае значэньне для Нямеччыны, што нямецкая дэлегацыя здолела выкінуць з гэтай рэзалюцыі ўсялякі намек, навет на якое-сь „усходняе Лёкарно“...—Гэта значыць—усялякую думку аб нейкіх дадатковых гарантыях для польска-нямецкіх граніцаў — падобны тым, якія атрыманы былі Францыяй і Бэльгіяй для сваіх граніцаў з Нямеччынай у Лёкарнскім Трактаце.

Польская ўрадавая прэса — аб пачыне і яго пасьпеху ў Лізе.

Цікаўным водгукам у Польшчы гэтых прамоваў у Лізе зьяўляецца стацьця аднэй з урадавых газэтаў — „Дзен. Львоўск.“ Ен піша:

„Польшча накінула сабе ў Лізе становішча пасрэдніка між вялікімі дзяржавамі і меншымі“... „Гэтае становішча можа прынясьці Польшчы вялізарныя карысьці, трэба толькі — ня сходзіць з гэтага шляху. Становішча Польшчы — вельмі сільнае. Што Брыян быў нездаволены з польскага пачыну, які крыжаваў яго палітыку паразуменьня Францыі — Англіі — Нямеччыны, гэта—глупства („то — ніц“). Глупства таксама („на ніц“) — лядова халодныя адказы Чэмбэрлена, скэптычныя вывады Шалоя (італьянскі дэлегат), як і здушаная ў сябе бешанства нямецкай дэлегацыі (зн. зап.). „Далей аўтар кажа, што ўсе гэтыя вялікія дзяржавы прыхіліліся да польскай прапазіцыі й толькі з страху перад больш небясьпечнай для іх мірнай прапазіцыяй Галяндыі“...

Гэткім чынам—„ад Друскенікаў да Жэнэвы ідзе проста да мэты сіла польскай волі“... Чаму—„ад Друскенікаў“.—„Уласна таму, што Друскенікі, гэтая летняя сядзіба марш. Пілсудскага, ёсьць крыніцай яго волі, ніхто ў Эўропе ня можа навет думаць аб магчымасьці марнаваць прэзэнтаваныя гэтай воляй вартасьці — ў млыну кампрамісаў“... у канцы стацьці аўтар заяўляе, што „гэткі характэр“ волі марш. Пілсудскага „дае гарантыі, што польская акцыя ў Лізе будзе праведзена паступова да канца“...

Няма што казаць—моцна сказана. Шкада толькі, што п. польскі дэлегат Сокаль не прачытаў у свой час гэтай стацьці: пэўна ж—не зрабіў бы Чэмбэрлеау, Штрэзэману ды Брыяну тых уступак, якія зусім пазбавілі сілы і зьместу „польскую акцыю“ ў Лізе Народаў...

У кожным разе характэрна, што ўрадавая прэса ў Польшчы добра зразумела дыплёматычныя рэзультаты „ідучай проста з Друскенікаў у Жэнэву волі“, падсумаваўшы іх вельмі трафна: — „нездаволены Брыян“, „ледава-зімны Чэмбэрлен“, „няверны Шалоя“, „бешаны Штрэзэман“...

Вось гэтыя „рэзультаты“ ўжо бясспрэчна прывязе з Жэнэвы п. Сокаль—але — ня толькі ў Друскенікі, але і ў Варшаву...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Праўда аб амэрыканскай пазыцы.

Паважная польская гандлёвая часопісь „Тыгоднік Гандлёвы“ зьвярнулася да ўраду і грамадзянства з запытаньнем, сколькі запраўды атрымаў польскі ўрад з тэй заграпічнай пазыкі, якая была часткова быццам рэалізавана ўлетку?

Як ведама, некалькі разоў афіцыяльныя камунікаты сьцьвярдзілі, што—ў лік вялікшай пазыкі ў 60 мільён. даляраў мае быць зрэалізавана ўвосені (бо вясной Амэрыка.. ня мела пры сабе грошаў!) Польшча атрымала толькі частку яе—ў разьмеры 15 мільёнаў даляраў. Аб гэтай суме 15 міл. даляраў выразна казаў і дэкрэт Прэзыдэнта 11 ліпня с. г., якім польскі ўрад быў упаўнамочаны зрабіць пазыку—„на суму да 15 міл. даляраў“. А ж тым часам цяпер у афіцыяльным органе мін. Скарбу „Гандэль і Прамысловасьць“, у яго апошнім нумары ня менш выразна сказана, што „польскі ўрад—у межах упаважненьня, дадзенага дэкрэтам п. Прэз. з 11 ліпня с. г.,—заключыў з саюзам амэрыканскіх банкаў умову аб кароткатэрміновай пазыцы—на суму 15 мільён. злотых“... Дык выразна: злотых, але не даляраў... Каб ня было ніякага сумліву, у тым самым нумары таго-ж афіцыяльнага органу зьмешчана і адозва амэрыканскіх банкіраў, даўшых пазыку, да польскага грамадзянства, якая так сама выразна кажа аб суме — 15 мільён. злотых... Нажаль, навет ня ведама,—якія гэта злотыя: ці курсавыя, ці „наміналь-ныя“, ці „ў золаце“. Тады выходзіць, што—калі гэта простыя, „абежныя“ злотыя, дык гэта значыць амырыканцы згадзіліся даць польскаму ўраду ў 9 разоў менш, як аб гэтым пісалі афіцыяльныя камунікаты... Бо-ж пэўным здаецца, што польскі ўрад хацеў, каб пазыка была „ў далярах“, але банкіры далі вось толькі ўсяго— „ў злотых“...

І аб гэтым польскае грамадзянства даведалася толькі праз некалькі месяцаў... Цяпер робіцца зразумелым, чаму гэта польскі ўрад не падаў пазыковай умовы—ані да зацьвержаньня, ані навет да ведама Сойму, робячы ды пакідаючы ў краі „відзімасьць“ быццам мае „даверыя“ (крэдыту) ў Амэрыцы аж на 15 мільён. даляраў, а тым часам узапраўднасьці меў гэтага „даверыя“ ў 9 разоў менш, ня кажучы ўжо аб тым, што—на вельмі кароткі тэрмін: толькі на паўгоду...

Але і гэта яшчэ ня ўсё. — У аднэй з апошніх справаздачаў Польскага Банку стаіць, што Банк дагэтуль зусім ня выкарыстаў гэтай амэрыканскай пазыкі, якая дадзена (— так сама вельмі характэрна!) толькі і выключна на падтрыманьне злотага—на выпадак яго спадку. Можа стацца, што і ня выкарыстае зусім да канца году... Тады — ўся пазыка будзе невыкарыстана наагул.

Дык дзеля чаго дзяржаўны скарб плаціў банкірам працэнты, „правізіі“ розным пасрэднікам і т. п. г. З усяго відаць, што „гешэфт“ амэрыканскіх банкіраў быў, хаця і малы, але—бясспрэчна бясьпечны і карысны для іх... Але вось для Польшчы, для яе скарбу—дык быў амаль-што ня чыстым мінусам...

Няма нічога тайнага, што-б ня выплыла наверх, кажа адна разумная кніга...

Ізноў „жывы нябошчык“ засядае.

Колькі дзён таму распачалася ізноў — пасьля летняга „адпачынку“ ад цяжкіх трудоў—сэсія слаўнай „крэсавай сэкцыі“, ці цяпер — Камітэту рэчазнаўцаў меншасьцёвых спраў. На паседжаньнях зроблены даклады аб справах меншасьцёвага школьніцтва, аб канфэрэнцыі меншасьцяў у Жэнэве, аб кангрэсе сіоністаў і г. д. Пагутарылі ізноў аб нядзельным адпачынку для жыдоў, і...

Чаго—„і“? І—досьць!..

Новая сэсія мае быць у канцы кастрычніка.

Справа пасла Попеля.

Старшыня Сойму зажадаў ад суда, разьбіраўшага справу ген. Жымерскага,—дакладных вестак аб тым, у якой меры зьвязаны з гэтай справай пасол Попель.

Гэты пасол, як ведама, зьяўляецца старшынёй „Нацыянальна-Работніцкай Партыі“ ў Сойме, а з другога боку—вельмі скампрамітаваны ў афэрах ды хабарах ген. Жымерскага...

Раскол у партыі „Пяста“.

„Роботнік“ піша аб пачаўшымся расколе ў партыі „Пяста“, у якой — шмат сяброў ды паслоў нездаволены палітыкай Вітоса. Проці Вітоса асабліва выступае віцэ-маршалак Сойму Бойка. З другога боку ёсьць група, якая імкнецца ўжо датарнавацца да ўраду, дый навет пачала выдаваць газэту ў духу „пілсудчыкаў“... Дык трэба спадзявацца мо‘ новага расколу сярод „Пяста“.

Пратэст варшаўскай прэсы проці нападу на рэд. Мостовіча.

Управа Таварыства Варшаўскіх Журналістаў прыняла такую пастанову:

„Выражаем глыбокае спачуцьцё п. Мостовічу, які стаўся ахвярай страшнога нападу бандытаў, падшываючыхся пад нейкую ідэйнасьць“...

Забастоўка ў Влацлавку.

Ад 2 гэтага месяца трывае забастоўка ў фаянсавых фабрыках у Влацлавку. Бастуе блізу 800 работнікаў. Фабрыканты адмаўляюцца даць якую колечы падвышку. Работнікі трымаюцца стойка, настрой добры.

Польскі міністар асьветы адмовіўся гутарыць з дэлегатамі студэнцтва.

Амаль ня ўся польская прэса „зьдзіўлена“ адмовай міністра асьветы п. Добруцкага прыняць дэлегацыю студэнтаў, якая зьвярнулася да яго ў справах карпарацыйна-студэнцкіх, але зусім не палітычных. Міністар тлумачыў адмову тым, што гутарыць з студэнцтвам ён можа толькі — праз рэктароў унівэрсытэтаў!

Ці-ж студэнцтва, як карпарацыя, падпарадкавана „ужэндова“ рэктаром, як „начальству“? — слушна дзівіцца прэса... Дый навет дэлегацыі арганізаваных урадоўцаў прымаюць міністры — паміма іх начальства, а студэнтам адмаўляе іх міністар, дый яшчэ „радыкальны“...

Ген. Загурскі знойдзены?!

Газэты перадрукоўваюць сэнсацыйную вестку „Рэчыпаспалітай“, якая першая паведаміла аб тым, што ген. Загурскі знойдзены. Газэта не сканфіскавана за гэтую вестку, дык трэба думаць, што вестка, можа, праўдзівая...

Газэта апавядае цікаўную гісторыю гэтага „знаходу“ прапаўшага генарала. Аказываецца, быццам, што звольнены ды прапаўшы вязень ваеннага вастрогу сядзіць схаваны пад Гданскам на так званым Вэстэрплятэ, дзе знаходзяцца польскія склады амуніцыі. Генарала так добра сьцераглі, што, каб даць аб сабе вестку, ён мусіў выявіць вялікі спрыт, у чым, як пабачым ніжэй, ён аказаўся запраўдным мастаком.

Як кажа тая ж газэта, варшаўская ўстанова Таварыства Помачы сем‘ям пагібшых лётнікаў атрымала пісьмо гэткага зьместу:

„Пры гэтым далучаю верасьнёвую рату ў ліку 40 злотых“...

На пісьме няма — ані даты, ані мейсца, дзе ён пісаны. Есьць толькі пячаць пошты ў Гданску.

Але ў управе Таварыства добра ведалі руку ген. Загурскага, які быў доўга шэфам усяго лётніцтва ў Польшчы... Дык гэты ліст зараз-жа быў перададзены сьледчым уладам,—але не маёру Мазуркевічу, як чамусьці падчырківае газэта, а палкоўніку Пёнткоўскаму... Па гэтаму сьледу быццам ужо і знойдзены схаваны — проці яго волі невядома кім! — вязень...

Газэта дадае, што вязень аказаўся спрытнейшым, чым ягоныя дазорцы, якіх ён здалеў пераканаць, быццам так цёмна і сьлепа напісаны ліст ніколі ня выдасьць тайны яго пабыту, дый што дапамагчы ўдовам і сіротам пагібшых герояў польскага ваеннага лётніцтва, — гэта-ж шляхотны абавязак...

Цікаўна цяпер, як высьвятліць справу сваей „уцечкі ў... Бразілію“, (як гэта цьвярдзілі „прэсавыя бутэрброды“)... сам „уцёкшы“?!

Паводле апошніх газэт, весткі газэты „Рэчпасп.“ аб тым, што ген. Загурскі ўжо знойдзены ў Гданску — на польскім абшары, не пацьвярдзіліся. Няведама навет нічога з лісту, калі ён пісаны, ды што гэтая рата ў 40 злотых — гэта не ахвяра з боку генарала, але — сплата яго пазыкі ў касе Таварыства. Дый здаецца сплата—вельмі спозьненая.

Газэты пішуць, быццам што-дня трэба спадзявацца афіцыяльнага камунікату з боку ўраду — аб стане сьледзтва ды шуканьня прапаўшага вязьня. Быццам сьледчая ўлада ўжо выкрыла месца бытнасьці генарала.

Заграніцай.

У справе францускa-радавых адносінаў.

Францускае агенцтва даведалася, што рада міністраў выразіла думку, што Ракоўскі павінен быць адкліканы з становішча радавага пасла — дзеля ўтрыманьня добрых адносінаў між Францыяй і Радамі. Але — з прычыны адсутнасьці Брыяна — адлажыла канчальную пастанову да наступнага паседжаньня — у прысутнасьці Брыяна. Справа ідзе аб тое, што Ракоўскі, як сябра Камінтэрна, надпісаў паміж іншымі адозву да работнікаў і жаўнераў усяго сьвету, у якой Камінтэрн заклікаў да арганізацыі сілаў і шырэньня працы камуністаў усіх краёў.

Як ведама, сярод францускага ўраду ёсьць дзьве групы: адна з Пуанкарэ і Саро на чале, імкнецца, відаць, да такога-ж разрыву з Радамі, які зрабіла Англія; другая, на чале з Брыянам, Эрыо і інш., стаіць за захаваньне стасункаў. Дык ясна, што, калі Брыян паехаў у Жэнэву, дык проці-радавая група хацела правясьці сваю думку, ці прынамсь — сільней завастрыць адносіны з радавым урадам...

Чычэрын запрапанаваў францускаму ўраду трактат міру.

Францускае прэса даносіць, быццам Чычэрын запрапанаваў Брыяну—распачаць перагаворы аб заключэньні трактату прыязьні ды ўзаемнага неўмяшацельствз ў унутраныя справы абодвух краёў.

Францускі ўрад яшчэ ня даў адказу.

Забойства італьянскага консула ў Парыжу.

У Парыжу ў гмаху італьянскага пасольства забіты італьянскі віцэ-консул граф Нардіні. Забойца—Сяргей Дімондіно — работнік-муляр, які жыў апошні час у Парыжу і належаў, здаецца, да анты-фашыстаўскай арганізацыі. Пасьля забойства ён быў так зьбіты ў пасольстве, што дагэтуль ня можа вярнуць здольнасьць мовы. Тлумачыць свой паступак адмовай з боку пасольства на паварот яго дамоў, дзе ён мае жонку й дзіця.

Італьянскія газэты пачалі ізноў кампанію проці Францыі, якая ўзгадоўвае ў сябе варагаў фашызму.

Вялікая заграпічная пазыка для Баўгарыі.

Фінансавы камітэт Лігі Народаў пастанавіў даць Баўгарыі пазыку лікам 10 мільёнаў фунтаў, ці—50 мільёнаў даляраў.

А вось, Польшчы, дык далі толькі 15 мільёнаў злотых...

Японія пагражае акупацыяй Манджурыі.

З прычыны няспыняючыхся проціяпонскіх разрухаў у Манджурыі, японскі дэлегат пры ўрадзе Чанг-Тсо-Ліна заявіў апошняму, што, калі той ня здолее сам сваімі сіламі спыніць гэтыя праявы ненавісьці, тады Японіі прыдзецца ўвясьці ў Манджурыю свае войскі — „дзеля забясьпечаньня спакою ды бясьпечанасьці сваіх грамадзян“...

Зьбядненьне насяленьня у Польшчы.

Ня гледзячы на ўсе-ўсялякія пасьпехі польскага ўраду на ўсіх шляхох ды галінах жыцьця, насяленьне Польшчы—ўбажэе, галее... Гэта сцьвярджаюць ня толькі „Работнікі“, але—і „Кур. Польскія“, органы буйнай буржуазіі, дый—прыязныя да ўраду...

„Край наш... галее“,—піша „Кур. Польскі“.—„Польскі грамадзянін не дайшоў яшчэ да даваенных нормаў, але—яшчэ горш: апусьціўся ніжэй у сваім жыцьцёвым роўні навет раўнуючы з варункамі першых гадоў пасьля вайны“.

Газэта падае прыраўнаўчыя лічбы спажываньня мяса, якое зьяўляецца агульна прынятай мерай апрaвізацыйнага дабрабыту народаў.

Дык вось:

У 1925 г. мяса спажываў кожны чалавек у Польшчы—41,90 кілягр. у год; у 1926 г.—толькі 39,90—а ў 1927—толькі ў першай палове—ўжо толькі 38...

Зразумела, гэта ня значыць, што кожны меў столькі мяса ў год — роўна з іншымі—селянін ды работнік з панам. Паны, як ведама, зьядаюць, можа, 99% гэтага мяса, пакідаючы сотую долю мільёнам працоўных.

А вось—дзеля прыраўнаньня — сколькі спажывае „адна галава“—накруг — мяса ў другіх краёх: у Нямеччыне — 53,80 кгр., у Францыі—55, у Англіі аж—162...

А трэба дадаць яшчэ, што гэтае мяса там разьдзяляецца значна раўней, чым у Польшчы.

Дзеду Беларусу.

Захістаўся гай сукрысты.
Дуб да дуба цёмналісты
Пахінуўся — разьвярнуўся.
Дзікі вецер буйна ўзьняўся,
Да зямлі ламае — гне ўсё.
Гром грукануў пяруністы, —
Лінуў цёплы дождж.
Па палянцы ж ля дубравы,
Кладучы зямліцу ў лавы,
У сарочцы, шапку ўзьняўшы,
Грудзі ў міг пераждагнаўшы.
Гнедка пугаю сьцябнуўшы, —
Сыплець дзедка сівы—жвавы,
Сыпле — круце плуг.
Яму дожджык — міласьць Божа:
Бач, як просіць яго збожжа!
Разважае: „Ах то добра...
„Ну, ты, гнедка, це хвароба! —
„А то бач: як попел глеба,
„Ярына дык ажыве ўжо —
„Дасьць Бог ураджай“.
Гэй ты, дзедка, гэй ты мілы,
Шмат паклаў свае ты сілы
Вось на гэтым на папары,
Шмат жыцьцёвай цябе хмары
Аблівала потам, стары;
Не зламалі дуб пахілы
Бурныя вятры.
Не змаглі жыцьця сухоты.
Усяго роднага свайго ты
Не адрокся, ня цураўся, —
У крыўдзе дух твой гартаваўся,
З горам век, з бядой змагаўся.
Пранясьліся ж жыцьця слоты —
Расквітнеў наш край!
Дык прымі-жа ад унукаў
Ты ўдзячнасьць за навуку...
Дзедка, вер: расьце надзея,
У сэрцы іскра моцы тлее, —
Ужо нас цемра не здалее
Закаваць на зьдзекі, муку.
Дзякуй шчыра за навуку
Табе, мілы дзед!

М. Васілёк

ХРОНІКА.

10-лецьце беларускае сярэдняе школы. 17-га гэтага верасьня прыпадаюць дзесятыя ўгодкі закладзінаў першае беларускае гімназіі. Гімназія была закладзена ў Слуцку 17-га верасьня 1917 году. Першым дырэктарам-арганізатарам яе быў грам. Р. Астроўскі, які цяпер знаходзіцца ў вастрозе ў Вронках.

З ініцыятывы Віленскае Беларускае Гімназіі—найстарэйшае ў межах Зах. Беларусі—у найбліжэйшым часе мае адбыцца абход гэтых угодкаў. Трэба думаць, што грамадзянства горача адгукнецца на гэтае культурнае сьвята.

Падробнасьці абходу своечасна падамо.

Суд над беларускімі вучнямі. Як падае „Слово“, у Наваградку ў акружным судзе 14 верасьня распачаўся працэс 15 маладых хлапцоў ад 17 да 21 гадоў веку, якіх вінавацяць у належаньні да Камуністычнага Саюзу Моладзі (Комсомол), шырэньні камуністычнае літэратуры і вывешваньні камуністычнага сьцягу. Сярод вінавачаных — 9 вучняў беларускае гімназіі ў Наваградку.

Канфіскацыя „Нашае Праўды“ ў Беластоку. Як падае „Глос Правды“, паліцыя ў Беластоку канфіскавала ў прадаўцоў „Нашу Праўду“ з 7-га верасьня — за падачу весткі, якая шырыць сярод насяленьня... паніку!

Цікаўна ўсё-ж такі было-б выясьніць: ці запраўды хоць адзін жывы чалавек у межах усяе Заходняе Беларусі нечым быў напалоханы ў сканфіскаваным нумары газэты?!

Апраўдываюцца перад Эўропай! Банда палітычных спэкулянтаў, якая стварыла ашуканскі „Нацыянальны Камітэт“ у Вільні з „истинно-русским“ сэнатарам Багдановічам на чале, — зьмяшчае сваё „апраўданьне“ ў толькі-што выпушчаным № 7 — 8 журнала „Natio“, падаючы ведамую ўжо нашым чытачом ілжу, быццам прэзыдыум Камітэту не хацела склікаць сходаў яго, ды быццам „траціна“ (?!) сяброў Камітэту (нам ведамы толькі два: Ярэміч і Стэповіч!) склікала сход сама ды зрабіла перавыбары прэзыдыуму.....

Лгаць, дык лгаць — і перад Эўропай, ды ў чатырох мовах адразу... Але не на старой ілжы гэнае банды хочам сягоньня затрымацца, а на тым новым аргумэньце, якім банда карыстаецца, каб апраўдаць сваё машэнства перад эўрапэйскай буржуазіяй. Аргумэнт гэты — ілжывая заява-данос, быццам прэзыдыум Камітэту быў зложаны „з людзей з вельмі блізкай да камунізму орыентацыяй“. Ну, дык ведама-ж: раз „камуністы“, дык у барацьбе з імі можна карыстацца і машэнствам,—заходняя буржуазія апраўдае гэта!

Тут гожа адзначыць, што старшыні запраўднага Нацыянальнага Камітэту—грам. Савіцкаму, чалавеку ведамаму сваей беспартыйнасьцяй, — польская адміністрацыя неўспадзеўкі сёлета забараніла выкладаць у Віленскай Беларускай Гімназіі, дзе ён працаваў, як вучыцель, ужо пяць гадоў. Цяпер—пасьля публікацыі ў журнале „Natio“—ясна, хто зрабіў польскім уладам ілжывы данос на грам. Савіцкага!

Беларусы ў віленскім самаўрадзе. Пры выбарах часовага прэзыдыуму рэвізыйнае камісіі за заступніка старшыні выбраны беларус — радны Кузьма Крук.

Выезд на вёску. У мінулую нядзелю драматычная дружына Т-ва Бел. Школы з Вільні езьдзіла ў Тургелі, дзе была пастаўлена п‘еса „Паўлінка“. Трэба спадзявацца, што дружына часьцей будзе выяжджаць на вёску, дзе праца яе асабліва цэнна й патрэбна.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Нацыянальная сьвядомасьць расьце.

(В. Вялікая Лотва).

Нацыянальная сьвядомасьць нашых вёсак з кожным днём расьце і шырыцца. Тыя вёскі, якія яшчэ ўчора спалі, сягоньня працерлі вочы і дружна ўзяліся за работу, „дом народны будаваць“. Для прыкладу вёска Вялікая Лотва, Ляхавіцкае вол., Баранавіцкага пав. Тут яшчэ да гэтага году ўсё і ўсе спала моцным, нездаровым сном. Нашая вёска не дарма называецца „Вялікай“—усяго тут ёсьць 180—190 дамоў, і каля 1000 жыхароў. Але і не дарма кажа прыслоўе: „Вялікі да неба, а дурны, як трэба“. Так і тут вёска вялікая, моладзі многа, а нічога людзкага ніколі ня было. П'янства, музыкі злучаныя з гарэліцай, бойкі і г. д. І толькі на сялётнія Коляды па ініцыятыве гр. Янкі Зеляноўскага быў наладжаны прымітыўны спэктакль, кажу прымітыўны, бо ня было сцэны. Згулялі „Лекары і лекі“—жарт ў 1 акце Гаротнага. Летам у гумне па ініцыятыве таго-ж гр., быў наладжаны прыгожы спэктакль-вечарына з праграмай: „Страхі жыцьця“—драма ў 3-х актах Ф. Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка“—жарт у 1 дзеі Родзевіча. „Страхі жыцьця“ прайшлі нуднавата, вяла, аматары не маглі застасавацца да сваіх роляў, ня ведалі значэньня многіх слоў, першы раз на сцэне—вось прычыны слабага ўражаньня. Маленечкая камэдыя „З. С.“ была выканана добра, рассьмяшыла глядзельнікаў да сьлёз. Наагул задаваленьне вялікае, хлопцы просяць яшчэ ладзіць падобныя вечарыны, а арганізатары абяцаюць у хуткім часе выканаць іх просьбу і мала таго зьбіраюцца наладзіць спэктакль у другой вёсцы Дарэўскай ці Мядзьведзіцкай гм.

Прыхільнік.

„На каго людзі, на таго і Бог“.

(Ярэміцкая гміна, Стаўпецкі павет).

Старадаўная беларуская прыказка кажа: „На каго Бог, на таго і людзі“. Але, як паглядзіш на сучаснае жыцьцё нашага селяніна, то здаецца, што гэту прыказку трэба казаць наадварот, — бо хто і як з яго, беднага, ня зьдзекуецца? Падаткаў бяруць гэтулькі, што і не пералічыць, і ад усякага падатку давай яшчэ кару. Пытаемся ў солтыса, за што гэта кара,—я-ж аддаю, калі кажуць? Атрымоўваецца адказ: — „Сягоньня атрымаў з гміны наказ платнічы і сягоньня мушу браць кару“. І вязе селянін на кірмаш апошні пуд збожжа на гэтыя падаткі з караю, ды забыўся са злосьці яшчэ дошчачкі да воза прычапіць, як пад'ехаў к мястэчку, дык ужо разам дзьве кары; за дошчачку і за незакелзаную кабылу. Прадаўшы, ды купіўсёе тое і ашуканы з усіх бакоў гандлярамі, паехаў селянін да хаты, цяжка ўздыхнуўшы з „добрага“ кірмашу. А дома?... Баба забылася наліць вады ў цэбар, паставіць памяло каля страхі, — трэцяя кара, сабака быў ня прывязаны — чацьвёртая кара, знайшла паліцыя ў агародзе дзьве калівы тытуню самасейкі, (бо садзіць усе баяцца) — пятая кара. Бедны селянін з болем у сэрцы аж за галаву хватаецца, Божа! Як жыць гэтак далей? Як збавіцца ад гэтых нязьлічаных кар? Мы, здаецца, сваімі мазолістымі рукамі ўсіх іх поім і кормім, а нам за гэта якая заплата? А ўсё віна — наша цемната. Дык жа і яе пазбыцца цяжка. Нашых дзетак і то не даюць вучыць у сваёй роднай мове, а прымушаюць нас да чужацкае мовы і культуры; мусіць хочуць, каб дзеці нашы сталі для нас чужымі.

Да ўсяе гэтае крыўды людзей над людзьмі і Бог дапамагае. Не забыліся яшчэ добра ўрагану, які прынёс ня мала беднаму люду на зіму голаду і холаду; як на дадатак да гэтага 14.VIII прайшла нябывалая навальніца, ад якое ў адной Ярэміцкай гміне было да пяці пажараў (пажары былі і ў суседніх вёсках і гмінах), у вёсцы Лядках, у жыхара Чубрыка Зьмітрука ў хаце забіла ад пяруна дачку з зяцем. Градам адбіла апошняе жніво — авёс. Агульныя страты вялізарныя. **Наш Дзядзька.**

Вясковыя спэктаклі.

Вёска Падлесьсе, Ляхавіцкае гміны—надта вялікая, ёсьць тут цэрква і да паўтары тысячы жыхароў. Да сёлетняга лета тут было глуха, пуста і цёмна, як у бочцы, ніякая газэта сюды не даходзіла, ніхто і ніколі ня ладзіў ніякіх вечарын, адным словам усё спала. А навакол моладзь краталася каля культурнае працы (в. Канюхі, Жарабковічы, Шчасновічы). Урэшце цяперашнім летам, дзякуючы стараньням і змаганьням 2-3 энэргічных, інтэлігентных хлапцоў, удалося з'арганізаваць тры вечарыны. Адыгралі наступныя п'ескі: „Страхі жыцьця“, „Зьбянтэжаны Саўка“, „Суд“ і „Боты“. Першы раз гульня была крыху слабаватая, аматары пераважна першы раз на сцэне, затым трацілі развагу, губляліся. Другі і асабліва трэйці раз аматары добра зразумелі і вывучылі свае ролі, так што выйшла вельмі гладка і спэктакль зрабіў прыемнае ўражаньне на глядзельнікаў.

Ня ведама, як надалей пойдзе распачатая праца, бо галоўныя аматары браг і сястра Смаршчкі вучань Віленскай і вучаніца Навагрудзкай беларускіх гімназіяў выехалі на заняткі. Усё-ж трэба верыць, што „зерне, кінутае ў ніву, ўсходзе ды красуе“, а пасьля прынясе багаты ўраджай. **Падляшанец.**

Хоць і наша костка, але сабачым мясам абрасла.

(Картуз-Бяроза, Пружаншчына).

У той час, калі ўсюды адбываюцца перавыбары гмінных радаў і войтаў, у нашай гміне ідзе ўсё па-старому, ня відаць ніякае перамены ці зьмены, ні палегкі. Як раней, так і цяпер пан войт цісьне людзей з усіх бакоў і чуе сябе чуць не царом у гміне. Лаянкі і пастрахі так і сыплюцца. 12/VII мне давялося па справе быць у гміне: патрэбна было пасьведчаньне, каб выехаць куды-кольвек пашукаць працы. У гэты самы момант прышла нейкая кабеціна і пачала прасіць пана войта, каб ён заплаціў запрацаваныя ею грошы па абслужываньню гміны. Можа падумаеце, што п. войт адразу-ж заплаціў? Дзе там! Ня толькі не заплаціў, а навет накінуўся на бедную кабеціну, чаму яна да гэтае пары не заплаціла даніны і што раней трэба заплаціць даніну, а потым ужо прасіць платы за працу. Потым пачаў страшыць, што ўсё папрадае, парасят, кароў, коней, што шкуры з усіх пазьдзірае, але падаткі сьцягне.

Што было далей, я ня ведаю, бо выйшаў з гміны. Але сваю пагрозу пан войт выпаўніў на ўсіх сялянах, бо праз 2 месяцы ні ў адной хаце быў лемант і енк, калі паны сэквэстратары забіралі кароўку, ці сьвінку, ці жыта. Людзі казалі, што войт прысягнуў пану старасьце, што ён сьцягне ўсе падаткі ў тэрмін. Ну з усіх сілаў і стараецца, каб як найхутчэй сабраць усё і заслужыць панскую падзяку. Але з свайго боку я скажу: „пане войце! гэтак далёка не заедзеш“. Калі ты выбраны народам, то і служы гэтаму народу. Ня трэба запамінаць і таго, што ў нас перавыбараў яшчэ ня было. **М. С. М.**

Трэба працаваць.

(в. Ганчары, Лідзкага пав.).

Селецкі гурток Т-ва Бел. Школы наладзіў 28-га чэрвеня г. г. спэктакль-вечарыну ў вёсцы Ганчары. Частку падгатаваўчай працы па прыспасабленьню хаты—разборку перагародкі і насьцілку зрабілі ганчароўцы, а рэшту самі артысты. Хату прыбралі абоямі так, што і пазнаць яе ня можна было. Перш адыгралі камэдыю „Сурдут і Сярмяга“ Ул. Гутаўскага, а потым „Лекары і лекі“ А. Гаротнага. Ня гледзячы на малую і новую відоўню, на якой цяжка была праводзіць масавыя сцэны, ня гледзячы на ўсё, артысты, дзякуючы сумленнай працы, вельмі добра справіліся са сваімі ролямі. Найбольш вызяліліся выканаўцы галоўных роляў — Вера Калавецкая, Манькоўскі і Язэп Чылек.

Таксама з вялізарным пасьпехам прайшла дэклямацыя вершаў: „Мужык“, „Край мой родны“, „Аб мужыцкай долі“ і інш. Усе жадаючыя не змаглі ўмясьціцца ў салі і многія стаялі пад вокнамі. Глядзельнікі, за выняткам 2 паліцыянтаў, былі ўсе беларусы, пераважна моладзь з Ганчароў і суседніх вёсак. Па спэктаклі пад ігру добра сыгранага маленькага аркестру адбыліся танцы, пяяньне песен, ігра ў флірт, якія зацягнуліся на доўга. Увесь даход ад спэктаклю-вечарыны пайшоў на бібліятэку-чытальню Селецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы. Гэты гурток за кароткі час свайго існаваньня (6 месяцаў), ня гледзячы на рабочую пару, здолеў ужо наладзіць 5 спэктакляў-вечарынаў (3—у Сельцах, 2 — у чужых вёсках і паставіць 6 п'есаў „Модны шляхцюк“, „Заручыны Паўлінкі“, „Сурдут і Сярмяга“, „Лекары і лекі“, „Калісь“ і „Пасланец“), адчыніць Народны Дом з бібліятэкай-чытальняй, накупіць тэатральных прыладаў і г. д. Уся гэтая праца была выканана самастойна (дазволы на спэктаклі атрымоўвала Акружн. Управа), ня гледзячы на перашкоды з усіх бакоў, толькі дзякуючы ідэальнай згодзе паміж сябрамі і агульнаму гарачаму жаданьню працаваць дзеля пашырэньня роднае асьветы.

Не магу не адзначыць тутака таго вялізарнага ўзгадаваўчага значэньня беларускіх вясковых тэатральных спэктакляў, якія ня толькі нясуць сьвет — новыя ідэі і новыя мысьлі ў глухія вёскі, але будзяць нацыянальную сьвядомасьць, пашану і любоў да роднае мовы, родзяць пэўнасьць у сваіх сілах, прыўчаюць да ахвярнай супольнай грамадзкай працы. **Праежджы**

Паляваньне.

У нядзелю 28.III Паўлюк Кухта (а празываюць яго Воўк) з вёскі Кавалі, Вялейскага павету, Войстамскай гміны, быў у цэркві і ішоў дамоў. Дзяцюк ішоў і быў рады, што сягодня абыйшлося бяз бойкі. Раптам убачыў „Воўк“, што ўсе дзяцюкі з вёскі Радакавічы, наганяюць яго, а ў кожнага з іх быў нож або кол. Воўк зразумеў, што гэта аблава на яго шкуру, „за старыя грашкі“ і кінуўся ўцякаць, а хлапцы за ім. Як не ўцякаў Воўк, сабакі былі блізка і ўжо аблізываліся на яго шкуру, але Ваўку пашэньціла, ён нагнаў хурманку, едучую ў Кавалі, ускочыў на воз таксама з адчыненым нажом і ўцёк ад аблавы.

Ці гэта яшчэ доўга ў нас будуць такія паляваньні?

Браты! пара апомніцца!

Вінцук Ленец.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Дамагайцеся сваей роднай беларускай школы, бо яна ёсьць мілейшая і бліжэйшая да душы Вашых дзетак.

Навука ў роднай беларускай мове больш зразумелая для Вашых дзетак, як у іншых мовах!

Кожны народ мае сваю родную школу, дык і нашыя беларускія дзеткі маюць на яе права, якога ніхто ня можа ад іх адабраць.

Складайце Школьнаму Інспэктару як можна больш дэклярацыяў, каб для вашых дзетак адчынілі ўрадовую беларускую школу, абоператварылі істнуючую польскую на беларускую.

Ня гледзячы на тое, што ўрад ня даў Вам беларускае школы на дэклярацыі, зложаныя Вамі ў мінулыя гады, падавайце нанова дэклярацыі ды яшчэ ў большым ліку.

Калі на Вашы дамаганьні ўрад адчыніў двухязычную, гэта значыць польска-беларускую школу, дык усёроўна складайце дэклярацыі, каб адчынілі чыстую белар. школу.

Ня бойцеся запугваньняў нясумленных людзей, якія рознымі спосабамі будуць нагаварваць, каб Вы не падавалі дэклярацыяў на беларускую школу.

Падавайце ў Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы ў Вільні—сьв. Ганны № 2— імёны і прозьвішчы тых, хто будзе Вас адгаварваць, або запугваць.

Аб усякіх надужыцьцях, ці то збоку паліцыі, ці адміністрацыі, ці гміны, ці прыватных асобаў безадкладна падавайце ў Галоўную Управу, каб пацягнуць іх да судовае адказнасьці за пагвалчаньне Вашых правоў, закону ад 31./VII. 1924 г. і распараджэньня Міністра Асьветы ад 7./I. 1925 г.

Дэкляpацыі і інструкцыі выпісвайце з Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы — Вільня, вул. Сьв. Ганны № 2.

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы.

Дэклярацыя.

Я ніжэй надпісаны (ая)...*грамадзянін (ка)*
(імя і прозьвішча)

Польскае Рэчыпаспалітае, беларускае нацыянальнасьці жыхар..............................
(назоў вёскі, места)

воласьці..........................*павету*..............................*як бацька *)—маці—*
(назоў воласьці) (назоў павету)

праўны апякун дзіцяці—дзяцей—у школьным веку.

1............................... *3.*..............................
(Імя дзіцяці) (Імя дзіцяці)

2............................... *4.*..............................
(Імя дзіцяці) (Імя дзіцяці)

на падставе артыкулу з уставу з 31 ліпня 1924 г., зьмяшчаючага некаторыя пастановы аб арганізацыі шкальніцтва (Dz. U. R. P. № 79, poz. 766), жадаю ўвядзеньня ў істнуючую — маючую адкрыцца публічную народную школу ў..............................*беларускае выкладовае мовы.*
(назоў вёскі, места)

Дня..............................*192*.........*г.* ....
(уласнаручны подпіс).

Да Школьнага Інспэктара

ў м...............................
(назоў места)

*) У тэксьце дэкляpацыі непатрэбныя словы закрэсьліць.

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.